ГА «Беларуская асацыяцыя журналістаў»

**Асвятленне парламенцкіх выбараў 2008 г. у беларускіх СМІ**

Бюлетэнь №3

*(1 –15 жніўня 2008 г.)*

Мэта маніторынгу – вызначыць, наколькі поўна ды ўсебакова беларускія медыя асвятляюць выбарчы працэс і дзейнасць тых суб'ектаў (як асобаў, так і структур), што ўдзельнічаюць у ім, а таксама наколькі апублікаваныя матэрыялы адпавядаюць прынцыпам журналісцкай этыкі і прафесійным стандартам журналісцкай працы падчас выбараў.

У аналізаваны перыяд адбывалася вылучэнне прадстаўнікоў у склад участковых выбарчых камісій і стваралiся названыя камісіі. Маніторынг ахоплівае 20 сродкаў масавай інфармацыі, а менавіта: тэлевізійныя і радыёпраграмы *“Наши новости» (ОНТ), “Панорама недели”* (*Першы Нацыянальны канал БТ*), *“Навіны рэгіёна”* (Гомель), “*Новости-Регион” / ТРК “Магілёў”,“Радыёфакт” (Першы нацыянальны канал беларускага радыё), “Навіны”, Гомельскае абласное радыё (101.3 FM*), *“Навіны”, абласное радыё ТРК “Магілёў”*, газеты *“Советская Белоруссия: Беларусь сегодня”, “Рэспубліка”, “Белорусы и рынок”, “Народная воля”, “***«***Комсомольская правда***»** *в Белоруссии”; “Брестский кур'ер”, “Гомельская праўда”, “Могилёвская правда”, “Днепровская Неделя”*, інтэрнэт-выданні www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by і інтэрнэт-версія “Еўрапейскага радыё для Беларусі” www.euroradio.fm.

**Асноўныя вынікі і некаторыя высновы**

У акрэслены перыяд у дзяржаўных медыя не адбылося істотных зрухаў датычна асвятлення выбарчага працэсу і яго суб'ектаў. Галоўнымі фігурантамі па-ранейшаму заставаліся Прэзідэнт, ЦВК і выбарчыя камісіі ніжэйшага ўзроўню.

Рэгіянальныя электронныя медыя (**“***Навіны рэгіёна”* (Гомель), *“Новости-Регион” / ТРК “Магілёў, Гомельскае абласное радыё (101.3 FM*), *“Навіны”, абласное радыё ТРК “Магілёў”* надалі выбарам яшчэ меней увагі. Гэтак, *Гомельскае абласное радыё (101.3 FM)* адвяло прагнозу надвор'я часу ў 12 разоў больш, чым выбарчаму працэсу. А магілёўскае тэлебачанне (“*Новости-Регион” / ТРК “Магілёў)* увогуле абмежавалася некалькімі секундамі, толькі аднойчы ўзгадаўшы пра акруговыя выбарчыя камісіі і электарат.

Падобную тэндэнцыю прадэманстравалі і рэгіянальныя дзяржаўныя газеты (*“Гомельская праўда”, “Могилёвская правда”, “Днепровская Неделя”).*

Інтэрнэт-рэсурсы www.belta.by, www.naviny.by, www.tut.by захавалі прыкладна тую ж, што і ў папярэдні перыяд, увагу да парламенцкіх выбараў. Аднак параўнальна з дзяржаўным інтэрнэт-выданнем БЕЛТА, дзе асноўная плошча (колькасць знакаў) адводзілася толькі двум суб'ектам (Прэзідэнту і ЦВК – амаль 87%), вышэйзгаданыя інтэрнэт-рэсурсы больш увагі пачалі надаваць іншым суб'ектам выбарчага працэсу. Так, www.naviny.by ЦВК і Прэзідэнту адвялі 37% плошчы (знакаў), а іншым суб'ектам -- 63%. Інтэрнэт-рэсурс www.tut.by - адпаведна 46% і 44% віртуальнай плошчы.

Заўважна шырэйшая на недзяржаўных сайтах і прысутнасць суб'ектаў выбарчага працэсу. Гэтак, www.tut.by асвятлялі дзейнасць (ці ўзгадвалі) 25 суб'ектаў, www.naviny.by – 24, а сайт БЕЛТА – 17.

Яшчэ менш увагі суб'ектам выбарчага працэсу, акрамя Прэзідэнта і ЦВК, надала дзяржаўная прэса. Гэтак, у *"Советской Белоруссии"* фігуравалі ў гэты перыяд толькі 6 суб'ектаў, прычым Прэзідэнту і ЦВК газета адвяла 90% плошчы, а 4 астатнім – 10%. *"Гомельская праўда"* прысвяціла заходнім назіральнікам і назіральнікам ад СНД 0,18% плошчы, а Прэзідэнту і выбарчым камісіям – астатнія 99,82%.

Гэткім чынам, відавочна, што дзяржаўныя медыя працягваюць асвятляць выбарчы працэс паводле надзвычай спрошчанай схемы, г.зн., не надаючы ніякай ўвагі іншым (акрамя ЦВК і Прэзідэнта) суб'ектам. Прапануючы такую схему, яны тым самым не інфармуюць выбаршчыкаў пра іншых (як рэальных, так і патэнцыйных) суб'ектаў выбарчага працэсу і іх дзейнасць.

Параўнальна з дзяржаўнай прэсай, недзяржаўныя газеты рэпрэзентавалі значна шырэйшае кола ўдзельнікаў выбарчага працэсу. Гэтак, *"Народная воля"* згадвала дзейнасць 17 суб'ектаў выбарчага працэсу, а *"Белорусы и рынок"* – 15.

Што тычыцца манеры рэпрэзентацыі суб'ектаў выбарчага працэсу і іх дзейнасці, то некаторыя дзяржаўныя медыя, хоць і без ранейшага імпэту, аднак працягвалі характарызаваць апанентаў улады ў негатыўным святле. Напрыклад, матэрыялы Дз. Крята і Н. Правалінскай у "СБ" (12.08.08), дзе ў псеўдавясковым скандальным стылі смакуюцца канфлікты ў апазіцыйных структурах. Між тым, варта звярнуць увагу на дастаткова карэктную заўвагу, якую падчас онлайнавай канферэнцыі зрабіла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына: *"Я могу сказать, что на вторник у нас были поданы заявления на регистрацию 165 инициативных групп. Да, там есть часть депутатов нынешнего созыва. Есть достаточно известные персоналии, которые называют себя представителями оппозиции. Но мы не хотим называть эти персоналии, потому что считаем, что в этом случае Центральная комиссия будет заниматься предвыборной агитацией"(*http://news.belta.by/ru/news/conference?id=13).

Гэткім чынам, паводле крытэрыяў Л. Ярмошынай, такія дзяржаўныя медыя, як *"СБ"*, ужо пачалі перадвыбарчую агітацыю супраць апазіцыйных партый і іх будучых кандыдатаў.

Акрамя таго, што недзяржаўныя выданні падалі больш поўную карціну выбарчага працэсу, яны і больш збалансавана паставіліся да яго ўдзельнікаў. Перадусім гэта тычыцца газеты *"Белорусы и рынок"*.

*"Народная воля"*, хаця і выявіла негатыўнае стаўленне да сённяшняй улады, аднак нейтральна пісала пра іншых удзельнікаў выбарчага працэсу, у тым ліку пра апазіцыю і назіральнікаў ад СНД. *"Брестский кур'ер"*, асвятляючы выбарчы працэс і яго ўдзельнікаў, трымаўся цалкам нейтральнай пазіцыі.

# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## БЕЛТА

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - колькасць знакаў






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Белорусы и рынок

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Euroradio**
01.08-15.08.2008

**Адзінка вымярэння - колькасць знакаў**






**BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008**

## Гомельскае абласное радыё 101.3 FM

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## ТРК “Магілёў”/”Новости-Регион”

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

## Агульнанацыянальнае тэлебачанне (АНТ)

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - секунда, хвіліна, гадзіна (0:02:45)






## BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**Рэспубліка**

01.08-15.08.2008

### Адзінка вымярэння - см. кв.






BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**“Беларусь сегодня”**

01.08-15.08.2008

**Адзінка вымярэння - см. кв.**






# BELARUSIAN PARLAMENT ELECTIONS 2008

**TUT.BY**

01.08-15.08.2008

## Адзінка вымярэння - колькасць знакаў




